Назва ТВП: Пойма Сожа

© С. Левый

Код: BY021

Геаграфічныя каардынаты: 52°40' N 31°08' E

Адміністрацыйная прыналежнасць: Гомельская вобласць: Веткаўскі раён, Чачэрскі раён

Плошча: 22865 га

Крытэрыі: A1, B2, A4i

Нацыянальны прыродаахоўны статус: частка тэрыторыі з’яўляеца мясцовым біялогічным заказнікам «Веткаўскі»

Міжнародны прыродаахоўны статус: ТВП міжнароднай значнасці

Агульнае апісанне:

Тэрыторыя ўяўляе сабой найбольш значны для захавання біялагічнай разнастайнасці ўчастак поймы ракі Сож ад горада Чачэрск да горада Ветка. Шырыня поймы на гэтым участку дасягае 5-6 кіламетраў. Пойма двухбаковая, месцамі левабярэжная альбо чаргуецца па берагах. З пойменных біятопаў па плошчы пераважаюць стэпавыя і забалочаныя лугі. У паніжэннях знаходзяцца нізінныя балоты з нязначнымі запасамі торфу. Рэчышча ракі вельмі звілістае, яго шырыня 50-90 метраў. Па пойме раскіданы нешматлікія, часта моцна зарослыя воднай расліннасцю, старыцы. Пойменныя лясы прадстаўлены толькі адной

невялікай дубравай. З усходняга боку да поймы прымыкае буйны лясны масіў – Чачэрскі заказнік.

Водны рэжым тыповы для раўнінных рэк Палесся. Высокая вясновая паводка пачынаецца ў канцы сакавіка, сярэдні ўзровень пад’ёму вады каля 4-5 метраў. Летне-асенняя межань перарываецца частымі дажджавымі паводкамі. На гэтым участку асноўнымі прытокамі Сожа з’яўляюцца рэкі Бяседзь, Нёманка, Покаць (левыя), Ліпа (правы).

Раней тэрыторыя поймы інтэнсіўна выкарыстовалася для сенакашэння і выпасу жывёлы. У 1986 годзе, пасля аварыі на ЧАЭС, гэты ўчастак поймы быў забруджаны радыануклідамі, у выніку чаго на некаторай яе частцы гаспадарчая дзейнасць спынена.

Асноўныя біятопы:

Поймавыя вільготныя разнатраўныя лугі – 72%, рэчыўчы і іх узбярэжжы – 5%, лясы – 20%, населеныя пункты – 2%, іншыя землі – 1%.

Птушкі:

У веснавы перыяд пойма цалкам заліваецца вадой, сухімі застаюцца толькі шматлікія дробныя астраўкі. Гэта стварае выключна спрыяльныя ўмовы для кармёжкі і адпачынку мігруючых гусей і кулікоў. У красавіку-маі тут спыняецца больш за 20 тысяч гусей і каля 30 тысяч кулікоў, самыя шматлікі з якіх белалобая гусь *Anser albifrons* і баталён *Philomachus pugnax.*

Пойменныя лугі з’яўляюцца месцам гнездавання вялікага грыцука *Limosa limosa* і дубальта *Gallinago media* – птушак, якія знаходзяцца пад глабальнай пагрозай знікнення. Высокую колькасць у гнездавы перыяд маюць таксама качка-чырка *Anas querquedula* і чорная рыбачка *Chlidonias niger*.

У гнездавы перыяд адзначаны вялікая белая чапля *Egretta alba,* качка-шылахвостка *Anasacuta,* качка-неразня *Anas strepera,* кулік-селянец *Tringa nebularia,* крывок *Haematopus ostralegus,* вялікі зуёк *Charadrius hiaticula.*

Іншыя групы жывел:

даследванні не праводзіліс.

Стан рэдкіх відаў птушак:

Віды	Статус	Колькасць	Год/перыяд ацэнкі	Дакладнасць ацэнкі	Трэнды (1996-2010)	Крытерый ТВП
Гусь-гуменніца *Anser fabalis*	мг	4000-6000 ас	2006 - 2010	Э		A4i
Гусь белалобая *Anser albifrons*	мг	13000-15000 ас	2006 - 2010	Э		A4i
Качка-чырка *Anas querquedula*	гн	400-600 п	2006 - 2012	Э		B2
Качка-шылахвостка *Anas acuta*	гн	+	2006 - 2011	П		
Чапля-лазянік *Ixobrychus minutus*	гн	+	2006 - 2010	П		
Чапля вялікая белая *Casmerodius albus*	гн	5-10п	2006 - 2012	П	↑	
Чорны бусел *Ciconia nigra*	гн	3-5 п	2006 - 2012	Э		
Каршун чорны *Milvus migrans*	гн	2 п	2006 - 2012	П		
Сокал-кабец *Falco subbuteo*	гн	2 п	2006 - 2012	П		

Віды	Статус	Колькасць	Год/перыяд ацэнкі	Дакладнасць ацэнкі	Трэнды (1996-2010)	Крытерый ТВП
Драч *Crex crex*	гн	300-400 с	2006 - 2012	Э	↓	B2
Крывок *Haematopus ostralegus*	гн	+	2006 - 2012	П	↑	
Зуёк вялікі *Charadrius hiaticula*	гн	+	2006 - 2012	П		
Баталён *Philomachus pugnax*	мг	+	2006 - 2012	П		
Дубальт *Gallinago media*	гн	100-130 с	2006 - 2012	Э		A1
Грыцук вялікі *Limosa limosa*	гн	20-40 п	2006 - 2012	Э		A1
Кулік-селянец *Tringa nebularia*	мг	+	2006 - 2012	П		
Крычка малая *Sternula albifrons*	гн	+	2006 - 2012	П	↑	
Рыбачка чорная *Chlidonias niger*	гн	150-300 п	2006 - 2012	Э	↓	B2
Звычайны зімародак *Alcedo atthis*	гн	30-50 п	2004	Э		B2

Віды	Статус	Колькасць	Год/перыяд ацэнкі	Дакладнасць ацэнкі	Трэнды (1996-2010)	Крытерый ТВП
Шчурка-пчалаедка *Merops apiaster*	гн	+	2006 - 2010	П		

Іншыя рэдкія і знаходзячыеся пад пагрозай знікнення віды:

Насякомыя: жужаль рашэцісты *Carabuscancellatus*, жужаль фіялетавы *Carabus violaceus*.

Расліны: касач сібірскі *Irissybirica*, шалфей лугавы *Salviapratensis*, дуднік балотны *Angelicapalustris*.

Пагрозы:

Веснавое паляванне на птушак, якое неадназначна уздзейнічае на птушак поймы Сожа:

- пазбаўляе мігрыруючых птушак магчымасці назапасціць рэчывы для працяглага пералёту і для вывядзення патомства;
- з’яўляецца моцным фактарам хвалявання для відаў, якія гняздуюцца на дадзенай тэрыторыі, бо некаторыя віды птушак прыступаюць да вывядзення птушанят раней, чым заканчваюцца тэрміны палявання.

Адмоўнае ўздзеянне на стан авіфауны ў гнездавы перыяд аказвае інтэсіўная рыбная лоўля, якая з’яўляецца адным моцным фактарам хвалявання для гняздуючыхся відаў.

Спыненне гаспадарчай дзейнасці ў пойме выклікала хуткае зарастанне адкрытых лугоў хмызнякамі, што прывяло да змяншэння разнастайнасці біятопаў.

Рэкамендацыі па захаванню:

Спецыяльных работ па вывучэнні флоры і фауны тэрыторыі не праводзілася. Для распрацоўкі прапаноў па ўтварэнні ахоўнай тэрыторыі неабходна правесці

дадатковыя даследаванні.

Забараніць веснавое паляванне (у крайнім выпадку абмежаваць час) на ТВП Пойма Сожа.

Крыніцы інфармацыі:

Асабістыя паведамленні: Горошко З.А., Кусенков А.Н., Мангін Э.

Скарбы прыроды Беларусі. – Мн.: Беларусь, 2005. – 215 с. (Інфармацыю падрыхтавалі: Казулін А.В., Парэйка А.А.).

Красная книга Республики Беларусь (Животные. Млекопитающие). - Минск: Беларуская Энцыклапедыя им. Петруся Бровки, 2004. – 318 с.

Складальнікі : Горошко З.А., Кусенков А.Н.

---

* *Выкарыстанне змешчанай тут неапублікаванай інфармацыі для навуковых публікацый без пісьмовай згоды яе аўтараў забаронена. У выпадку выкарыстання часткі кантэнту або старонкі цалкам на іншых інтэрнет-рэсурсах, абавязковая спасылка на аўтараў і сайт iba.ptushki.org*